**Багдановіч, Н.** За цяжкую працу зямны вам паклон / Н. Багдановіч, В. Караленка // Патрыёт (Ушачы). – 2019. – 20 лістап. – С. 1, 5.

# ЗА ЦЯЖКУЮ ПРАЦУ ЗЯМНЫ ВАМ ПАКЛОН

Зала раённага цэнтра культуры і народнай творчасці 16 лістапада напаўнялася намнога раней афіцыйнага пачатку ўрачыстасці. Дэлегацыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў заўсёды прыязджаюць загадзя, каб пагутарыць з калегамі, пазнаёміцца з выставамі, падрыхтаванымі для іх работнікамі хлебазавода, Дома рамёстваў, бібліятэкі і іншых установ. Ды і жадаючых пабачыць дзейства, прысвечанае святу аграрыяў, таксама шмат, таму яны спяшаюцца займаць месцы. Вось і сёлета запатрабавана была нават галёрка. Мерапрыемства ж атрымалася насычаным і цікавым: на сцэну падымалася намнога больш, чым звычайна, працаўнікоў сяла, былі і адметныя ўзнагароды, напрыклад, юбілейны медаль «100 год органам дзяржаўнага кіравання сельскай гаспадаркай і харчаваннем Беларусі».

Іх атрымалі ветэраны працы А. В. Шарыпенка і У. А. Крывапушчанка, якія ўзначальвалі вялікія калектывы на працягу дзесяцігоддзяў, а таксама перадавыя механізатары ААТ «Ільюшынскі» і КУСГП «Вялікадолецкае» Анатоль Дзмітрыевіч Спірыдзёнак і Сяргей Аркадзьевіч Філімонаў. Дзякуючы наватарскім пачынанням У. А. Крывапушчанкі, «Дружба» заўсёды была флагманам сярод сельгаспрадпрыемстваў раёна і вобласці, А. В. Шарыпенка доўгі час утрымліваў у лідэрах саўгас-камбінат «Арэхаўна», у які ўваходзіў і свінагадоўчы комплекс, а потым не проста захаваў маленькі «Дземенец», а і прымусіў «загучаць», значна пашырыўшы яго межы. Ён не змог прыйсці на свята (узнагароду атрымлівала яго жонка Людміла Міхайлаўна), але па-ранейшаму цікавіцца як станам спраў сваёй гаспадаркі, так і раёна. Канечне, як і У. А. Крывапушчанка. Наогул былых работнікаў сельскай гаспадаркі не бывае. Вось і запрошаныя на свята ветэраны райсельгасхарча В. В. Падвойская, З. Я. Кудраўцава, В. Э. Ісаковіч, А. М. Слашчова вельмі ўважліва ўглядаліся ў экран, слухалі аналітычнае выступленне старшыні райвыканкама, бо параўноўвалі, прыгадвалі часы, калі наш раён невыпадкова называлі аграрным – у гэтай сферы былі заняты тысячы ушачан – пераважная большасць працаздольнага насельніцтва.

«Перад намі стаіць задача – захаваць сяло. Падтрымліваючы сельскую гаспадарку, мы забяспечваем дынамічнае развіццё дзяржавы, бо харчовая бяспека – фундамент рэальнай незалежнасці любой краіны», – з такой думкі пачаў сваю прамову на ўрачыстасці кіраўнік раёна У. Г. Аўдошка. І прыемна канстатаваць, што сёлета намецілася станоўчая тэндэнцыя ў дзейнасці аграрнай галіны Ушаччыны. Так, тэмп росту вытворчасці прадукцыі раслінаводства склаў 106 працэнтаў да леташняга ўзроўню, валавы збор зерня – 20521 тону (149 працэнтаў), алейных культур – 1262 (109,6), нарыхтавана больш 28 тысяч тон сенажу і больш 23 – сіласу (102 і 107,4 працэнта адпаведна), атрымана 1890 тон мяса свініны і 842 – буйной рагатай жывёлы. Закладзены пэўны падмурак і для новага ўраджаю: пасеяна 5178 гектараў зерневых і зернебабовых, 1665 – алейных культур. Паспяхова рэалізуюцца інвестыцыйныя праекты, пад якія былі перададзены невыкарыстоўваемыя аб'екты: у надзвычай хуткія тэрміны адкрыты вытворчы ўчастак па вырошчванні свіней «Хадакова» філіяла «Зара» ЗАТ «Вітаграпрадукт», ёсць падставы меркаваць, што ўжо ў лютым з'явяцца гадаванцы і на былой МТФ «Слабада».

І за ўсімі станоўчымі лічбамі стаяць людзі. А іх у аграрнай галіне з кожным годам, на жаль, становіцца менш. Уладзімір Генадзьевіч прывёў красамоўныя лічбы: калі ў былыя гады толькі ў адных «Глыбачанах» працавала больш 1000 чалавек, то зараз ва ўсіх гаспадарках раёна іх засталося 648. Пачынаючы з 2012-га штогод колькасць работнікаў змяншалася прыкладна на 100 чалавек, сёлета, праўда, адток быў не такім значным – галіну пакінулі 10 працаўнікоў. Зрэшты, гэта яшчэ не самыя катастрафічныя лічбы: у Расонскім раёне, да прыкладу, засталося ўсяго 340 аграрыяў. Такім чынам, як ні парадаксальна, Ушаччыну сельскагаспадарчым рэгіёнам зараз назваць ужо нельга: у суме агульнай выручкі ад тавараў, работ і паслуг «аграрны ўнёсак» склаў па апошніх даных усяго 27 працэнтаў, тады як, напрыклад, гандлёвая сфера прынесла 48. Каб пераламаць тэндэнцыю, трэба ствараць годныя ўмовы працы і быту, плаціць дастойную зарплату, заахвочваць моладзь. І прыклады такія ў рэгіёне ёсць: на тым жа прадпрыемстве «Ларынаўка», што на Аршаншчыне, сярэдні ўзрост работнікаў – каля 30 год, а зарабляюць яны парадку 1500 рублёў.

Але ці могуць спадзявацца на нешта падобнае ў гаспадарках нашага раёна? У. Г. Аўдошка мяркуе, што падставы для гэтага ёсць: «Зараз мы напярэдадні эпахальнай падзеі: падпісання ўказа па стварэнні холдынгу «Віцебскі экапрадукт». Аграрыі скардзіліся, што, маўляў, мы вырабляем прадукцыю, а нехта забірае, перапрацоўвае і атрымлівае дадатковы прыбытак. Зараз жа ўсё будзе, як кажуць, «у адной кішэні». Гаспадаркам дадуць шанс пачаць «з чыстага ліста»: іх даўгі забярэ на сябе кіруючая кампанія. З'явіцца магчымасць выйсці з замкнёнага кола – забяспечыць вытворчасць сучаснай тэхнікай і аб'ектамі жывёлагадоўлі, па тэхналогіі весці сяўбу, а значыць, атрымліваць большы ўраджай і, адпаведна, павялічваць заробкі... Трэба быць аптымістамі, рухацца далей. Усё ў нашых руках!».

Вельмі працяглы час не сыходзіў са сцэны Уладзімір Генадзьевіч, паколькі ўручаў не толькі Ганаровыя граматы і Падзякі райвыканкама (імёны іх уладальнікаў мы друкавалі ў мінулым нумары), але і ўзнагароды галіновых органаў. Ганаровую грамату Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання атрымала жывёлавод ААТ «Ільюшынскі» Антаніна Уладзіміраўна Бірукова, падзяку Міністра – механізатар ААТ «Агра-Селішча» Алег Юльянавіч Крывёнак. Гэты сціплы трактарыст штогод задзейнічаны літаральна на ўсіх відах работ, таму не трапіў у лік пераможцаў у нейкай асобнай намінацыі. Тым не менш на ім і яшчэ некалькіх такіх жа безадказных работніках трымаецца гэта гаспадарка. Таму менавіта яму і дастаўся асаблівы падарунак – мабільны тэлефон, які на святкаванні 95-годдзя Ушацкага раёна ўручыў дырэктар інтэграцыйнай структуры «Полацкі камбінат хлебапрадуктаў» В. К. Хамёнак. Тады старшыня райвыканкама і паабяцаў уручыць яго аднаму з лепшых механізатараў раёна.

Ганаровую грамату камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблсельгасхарча атрымаў механізатар ААТ «Ільюшынскі» Аляксандр Пятровіч Майсеенка і яго малады калега з «Дземенца» Іван Віктаравіч Цароў. Падзяка камітэта была ўручана трактарысту-машыністу КУСГП «Глыбачаны» Генадзю Леанідавічу Качану і жывёлаводу ААТ «Ільюшынскі» Алегу Іванавічу Жуку. Лісты падзякі старшыні райвыканкама атрымалі кіраўнікі лясгаса, ДРБУ-105, камунгаса, прадпрыемства меліярацыйных сістэм за дапамогу, якую шэфы аказвалі на працягу ўсіх сельскагаспадарчых кампаній.

Вельмі многа на гэты раз у зале было маладых спецыялістаў, якім у раёне ўдзяляецца вялікая ўвага. Старшыня райвыканкама У. Г. Аўдошка ўручыў Лісты падзякі васямнаццаці юнакам і дзяўчатам, якія годна адпрацавалі сельскагаспадарчы цыкл поплеч з вопытнымі калегамі. Прыемна, што сярод іх 15 ураджэнцаў Ушаччыны, якія працягваюць справу сваіх родных. Побач з бацькамі ў кабіне трактара з задавальненнем бавілі вольны час Ілья Апёнак з «Маяка-Ушацкага» і Ілья Спірыдовіч з «Дземенца», а зараз самі рыхтавалі глебу ці перавозілі збажыну. На зернетоку не адны канікулы правёў і Павел Шарох з апошняй гаспадаркі, які вярнуўся сюды дыпламаваным спецыялістам. І калі не хапае вопыту тэхніку-механіку, звяртаецца да старэйшых калег, сярод якіх неаднаразовы пераможца жніва Аляксандр Уладзіміравіч Яловік. Спецыяльнасць дзеда Міхаіла Фёдаравіча Мамонава, былога кіраўніка калгаса «Прагрэс» абраў Вадзім, які зараз працуе інжынерам па ахове працы ў КУСГП «Вялікадолецкае». Яшчэ падчас практыкі ў гаспадарках раёна былі заўважаны кіраўніцкія здольнасці Крысціны Жарнасек, якой адразу даверылі пасаду намесніка галоўнага ветэрынарнага ўрача – брыгадзірам саўгаса «Ушацкі» ў свой час працаваў яе дзед Ігнат Адамавіч Валадзько.

Ужо не першы год менавіта з раённай сцэны віншуюць сваіх пераможцаў кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў. Да зямлі пакланіўся механізатарам «Полацкага камбіната хлебапрадуктаў» Юрыю Генадзьевічу Кісляку і Рыгору Дзмітрыевічу Курносаву дырэктар КУСГП «Глыбачаны» Алег Аляксандравіч Ляшчынскі. Прэміі таксама ўручылі працаўнікам «Ільюшынскага» Сяргей Анатольевіч Халімоненка, «Маяка-Ушацкага» – Аляксандр Яўгенавіч Шкодзін, «Дземенца» – Генадзь Аляксандравіч Шалыга. Зразумела, што кіраўніцтва гаспадарак стварала ўмовы, каб усе намінанты змаглі прыехаць на свята. А як мяняліся людзі! Хоць дзень таму сустракаліся з Аксанай Аляксандраўнай Дзіульскай, ледзь пазнала ў маладой жанчыне ў гіпюравай сукенцы даглядчыка комплексу «Маяк». Падзівіліся, як спраўляецца з каровамі простая мініяцюрная Кацярына Уладзіміраўна Чумакова з «Ільюшынскага». Аляксандр Селезень з апошняй гаспадаркі па такому выпадку нават пагаліў сваю модную бараду. Хоць і былі пры касцюмах з гальштукамі Аляксандр Мікалаевіч Гусёнак – цяпер ужо з «Дземенца» і Сяргей Міхайлавіч Вусько з «Вялікадолецкага», аднак гэта толькі маладзіла механізатараў. Апошні атрымаў Ганаровую грамату і прэмію як пераможца жніва з рук начальніка райсельгасхарча Сяргея Сяргеевіча Садоўскага – імёны лідараў

па ўсіх намінацыях мы таксама друкавалі ў папярэднім нумары. А вось А. М. Гусёнак – Ганаровую грамату абласнога прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу. Яе, як і граматы і падзякі раённай галіновай прафсаюзнай арганізацыі старшыня Пётр Аляксандравіч Алексяёнак уручыў таксама Мікалаю Аляксандравічу Саўчанку – аператару комплексу «Маяк», Ірыне Сяргееўне Маслюк – бухгалтару філіяла «Сарочына», Віктару Васільевічу Кажану – ветурачу філіяла «Ушацкі», Аксане Браніславаўне Любельскай – вядучаму ветурачу райветстанцыі.

Усе ў гэты дзень былі прыгожымі і вясёлымі. Спрыяў настрою і ўдалы канцэрт, падрыхтаваны супрацоўнікамі раённага цэнтра культуры, дзіцячай школы мастацтваў, самадзейнымі артыстамі. Трапна ляглі па тэме вясковая сцэнка, вакальныя і харэаграфічныя нумары, цымбалы. І, канечне, з задавальненнем прымалі на сцэне працаўнікі сяла сваіх артыстаў. Перш за ўсё для Галіны Канстанцінаўны і Валерыя Уладзіміравіча Літвін спявала іх нявестка Валянціна, для кіраўніка «Дземенца» Г. А. Шалыгі і дэлегацыі гаспадаркі – яго пляменнік Кірыл. У зале не было абыякавых, бо літаральна ўсе мы маем дачыненне да сельскай гаспадаркі і раздзяляем радасць з прадстаўнікамі самай пачэснай прафесіі.

**Наталля Багдановіч, Вольга Караленка.**